# НА КУПАЛА СОНЦА ЙГРАЛА



Гучаць сурмы і напеўная мелодыя цымбалаў.
**Купалінка:** Пойдзем, людзі, да ракі
Купальскую ночку праважаці.
**Купаліш:** Пойдзем, людзі, да ракі
Сонца сустракаці,
**Купалінка:** На світанку купацісь
І ў расе качацісь.
**Разам:** Пойдзем, людзі, да ракі!

На фоне музыкі пачынаецца шэсце, наперадзе ідуць чатыры хлопцы з паходнямі, запаленымі ад купальскага кастра. За імі наступныя чатыры хлопцы нясуць маленькі плоцік, на якім умацаваны сімвал Купалля — кола на шасце. За імі ідуць фальклорны калектыў і астатнія ўдзельнікі свята. Па дарозе да ракі гучаць песні, у якіх назвы мясцін можна мяняць:

Ой, Іванава сонейка
Хадзіла, хадзіла.
Харашэнька ўзышло на Івана
(Паўтараецца пасля кожных двух радкоў.)
—А дзе яму стаці?
— У Збуражы на вуліцы,
А ў Збуражы малайцы,
Як красныя панічы.
А ў Збуражы дзеўкі,
Як красныя паненкі,
А ў Збуражы маладзіцы,
Як белыя лебядзіцы.

*(Маларыцкі р-н)*

Ці:

Ой, рана, на Йвана
(паўтараецца перад і пасля кожнага радка).
Кругом сонца ходзе –

Недзе сонцу станавіцца.
Станавілася сонца ў Рогаве,
А ў Рогаве дзеўкі гладкі,
Дзеўкі гладкі – глядзець гадка.
Кругом, кругом сонца ходзе,
Станавілася сонца ў Шчарбінішчах,
А ў Шчарбінішчах дзеўкі худы
Дзеўкі худы, глядзець люба.

*(Новазыбкаўскі р-н).*

Але вось шэсце надыходзіць да ракі. Ужо ружавеюць воблакі на ўсходзе, над вадою сцелецца туман.

На ваду апускаецца плыт з колам, а на яго канцах становяцца хлопцы з паходнямі. Наступае цішыня, і толькі чутны спевы першых птушак. Усе чакаюць усходу сонца. Вось першыя залатыя промні дакранаюцца да зямлі, з-за небасхіла паступова вырастае сонца. І менавіта ў гэты момант гучыць песня:

А на Купалу
Рана сонца йграла,
Рана сонца йграла
На добрыя годы,
На добрыя годы,
На цёплыя росы,
На цёплыя росы,
На хлябы-ўраджаі,
На хлябы-ўраджаі.

*(в. Барсукі Віцебскага р-на, Суражскі р-н).*

На фоне песні хлопцы запальваюць кола і пускаюць плыт па рацэ. Дзяўчаты раскідваюць вакол плыта кветкі і вянкі і ў гэтым прыгожым рознакаляровым акружэнні плыве палаючае кола, абвяшчаючы канец Купалля. Гучыць урачыстая музыка.

**Купалінка:** Вось і закончылася нашае Купалле — свята росквіту зямлі, свята народнай творчасці...

**Купаліш:** Праводзілі мы сонца на другую палову года.

**Купалінка:** Хай і ў гэтай палавіне года

Кветка шчасця будзе ў народа,

**Купаліш:**Каб на зямлі калоссе рассцілалася

Ды шмат хлеба ўрадзілася,

**Купалінка:** Каб адзін аднаго паважалі,

Бацьку з маці не забывалі,

**Купалінка:** І няхай дапамогуць вам у гэтым рукі — чыстыя ад купальскай вады...

**Купаліш:** Ногі, дужыя ад купальскіх карагодаў...

**Купалінка:**Сэрцы, гарачыя ад купальскіх кастроў.

Фальклорны калектыў выконвае беларускую народную песню «Ой, рана, на Йвана».

Свята закончана. Жадаючыя могуць пакупацца ў цёплай, як сырадой, вадзе, пакачацца ў расе. Ідучы са спевамі дамоў, дзяўчаты вешаюць вянкі на рогі сваёй карове, якую ўжо выганяюць у поле, чапляюць на вуглы хат, дзе жывуць нежанатыя хлопцы.

*Сцэнарыі «Плыві, плыві, вяночак», «Папараць-кветка»,*
*«На Купала сонца йграла» падрыхтаваны*
*паводле А.М.Аляхновіча, П.А.Гуда*

